Голас Радзімы

23.05.2019

# Ваенная праўда з першакрыніц

Ганна Лагун

---

**У Нацыянальнай бібліятэцы ўрачыста распачаўся праект “Насустрач перамозе”, прымеркаваны да 75-годдзя Вызвалення Беларусі**

---




На святочную імпрэзу былі запрошаны паважаныя госці — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Наведнікі бібліятэкі цяпер могуць больш даведацца пра паўсядзённае жыццё, баявыя будні партызан Беларусі. У межах праекта “Насустрач перамозе” ўсе ахвочыя пабачаць аналагічную па назве мастацкую экспазіцыю “Насустрач перамозе”, кніжную выставу “Лясная песня”. Магчыма, і беларусы замежжа, наведваючы Бацькаўшчыну ў святочныя дні, таксама заглянуць у Нацыянальную бібліятэку.

Кніжная экспазіцыя “Лясная песня” — гэта навукова-папулярныя, літаратурна-мастацкія выданні, выяўленчыя матэрыялы й дзённікі партызанскіх брыгад з фондаў Нацыянальнага архіва й Нацыянальнай бібліятэкі. Прадстаўлены артыкулы беларускіх і расійскіх гісторыкаў пра партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі ў гады вайны, успаміны, артыкулы ветэранаў партызанскага руху й вядомых дзяржаўных дзеячаў БССР. Вялікая ўвага

надаецца вызваленчаму руху беларускага народа, ягонай ролі ў перамозе над фашызмам, захаванню памяці пра паўсядзённае жыццё й баявыя будні партызан Беларусі.

Мастацкая экспазіцыя “Насустрач перамозе” носіць назву агульнага праекта, зладжана ў адпаведнасці з ім. Прадстаўлены баявыя лісткі, карты баявых дзеянняў, планы мясцовасцяў, замалёўкі ў розных тэхніках (графічныя, акварэльныя), ілюстрацыі да артыкулаў з дзённікаў брыгад — па-мастацку апрацаваныя матэрыялы з фондаў Нацыянальнага архіва, якія ілюструюць творчыя здольнасці партызан, мірных жыхароў, праяўленыя ў ваенны час.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі на адкрыцці экспазіцый расказаў пра падрыхтоўку арыгінальных экспанатаў да выставы. Ён адзначыў, што праект “Насустрач перамозе” — добрая магчымасць дакрануцца да гераічнага мінулага продкаў, ён можа прыцягнуць увагу спецыялістаў, спрыяць новым навуковым даследаванням. Зладзілі праект разам Нацыянальная бібліятэка і Нацыянальны архіў Беларусі.

Азнаёміцца з выставай можна будзе да 20 ліпеня ў галерэі “Атрыум” (3-і паверх).